Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-04-12

# Aurea mediocritas – залатая пара даследчыка!

**Днямі ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі адкрылася кніжная выстава "Творчая лабараторыя даследчыка: каштоўнасці кніжна-пісьмовай культуры" і адбылася прэзентацыя кнігі "Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI—XVII стагоддзяў" вядомага філолага, гісторыка і філосафа, доктара філалагічных навук Івана Саверчанкі.**





Падчас прэзентацыі кнігі Івана Саверчанкі "Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI—XVII стагоддзяў": аўтар і дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі Аляксандр Лукашанец.

У экспазіцыі прадстаўлены помнікі кніжна-пісьмовай культуры Беларусі XVI—XVII стагоддзяў з фондаў аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ імя Якуба Коласа, якія былі прадметамі навуковага аналізу Івана Саверчанкі. У прыватнасці, выстаўлены шэдэўр кнігадрукавання Вялікага Княства Літоўскага — "Брэсцкая Біблія", выдадзеная ў 1563 годзе на сродкі ўплывовага магната Мікалая Радзівіла Чорнага, першае беларускае друкаванае "Евангелле вучыцельнае", выдадзенае 17 сакавіка 1569 года Іванам Фёдаравым і Пятром Мсціслаўцам у Заблудаве (у ім упершыню была змешчана пропаведзь славутага беларускага асветніка XII стагоддзя Кірылы Тураўскага "Слова на Ушэсце"), "Лексікон славянароскі" (Куцейна, 1653 год) і іншыя свецкія выданні XVI—XVII стагоддзяў.

Тут жа можна ўбачыць і шматлікія кнігі (навуковыя манаграфіі, падручнікі, тэксталагічныя выданні) самога Івана Саверчанкі, які з'яўляецца аўтарам каля дзвюх соцень навуковых даследаванняў. Самыя вядомыя з іх — "Старажытная паэзія Беларусі XVI — першай паловы XVII стагоддзяў", "Сымон Будны — гуманіст і рэфарматар", "Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока".

А ў цэнтры ўвагі была "Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI—XVII стагоддзяў" — найноўшая кніга даследчыка, што нядаўна ўбачыла свет у выдавецтве "Беларуская навука". Дырэктар Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі Аляксандр Лукашанец назваў гэтае выданне вельмі важным унёскам у вяртанне гістарычнай памяці беларусаў на пачатку XXI стагоддзя, калі наш народ актыўна сцвярджае сябе ў якасці паўнапраўнага і гістарычна абумоўленага суб'екта еўрапейскай супольнасці. А намеснік дырэктара Сяргей Гаранін звярнуў увагу прысутных на той факт, што кніга "Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI—XVII стагоддзяў" уяўляе сабой пераважна тэарэтычныя абагульненні, да якіх Іван Саверчанака ішоў многія гады, назапашваючы ў сваіх папярэдніх манаграфіях багаты фактаграфічны матэрыял. У прыватнасці, адна з яго ранейшых кніг, прысвечаная кніжна-пісьмовай культуры Беларусі эпохі Адраджэння і ранняга барока, сімвалічна называлася "Aurea mediocritas", што з лацінскай перакладаецца як "залатая сярэдзіна" — намёк на тое, што ў часы ВКЛ наша культура і пісьменства перажывалі свой "залаты век". Сёння ж і сам Іван Саверчанка, якому зусім нядаўна споўнілася 50 гадоў, увайшоў ва ўласную aurea mediocritas, залатую пару даследчыка, у якога, з аднаго боку, ужо набрана поўная фактаграфічная і метадалагічная база, а з другога — застаецца яшчэ шмат часу для рэалізацыі сваіх творчых задум.

У якасці вельмі сціслай анатацыі адзначым, што ў сваёй новай кнізе аб'ёмам амаль 500 старонак Іван Саверчанка сцвярджае, што беларускія пісьменнікі-інтэлектуалы, якія выйшлі на авансцэну нацыянальнага прыгожага пісьменства ў эпоху Адраджэння і барока (а гэта Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Стэфан ды Лаўрэнцій Зізаніі, Леў Сапега, Іпацій Пацей, Мялецій Сматрыцкі, Іасафат Кунцэвіч, Іосіф Вельямін-Руцкі, Андрэй Мужылоўскі, Афанасій Філіповіч і многія іншыя — якой жа багатай уяўляецца наша кніжная спадчына ўжо пры адным гэтым пераліку!), прапанавалі адказы на антрапалагічныя пытанні быцця, акрэслілі неабмежаваныя магчымасці чалавечага розуму ў спасціжэнні навакольнага свету, паставілі на парадак дня праблему эвалюцыі Зямлі і жыцця, сфармулявалі базавыя прынцыпы суадносін дзейнасці чалавека з законамі прыроды і космасу. Яны прадставілі тагачаснай эліце глыбокія распрацоўкі маштабных грамадскіх пераўтварэнняў, напрамкі развіцця адукацыі і асветы, праграму рэформ дзяржаўных інстытутаў і ўдасканалення ўлады, судовых органаў, распрацавалі гуманістычныя прынцыпы адносін паміж сацыяльнымі станамі і канфесійнымі супольнасцямі, а таксама выпрацавалі нормы эфектыўных міжнародных і міждзяржаўных адносін. У старабеларускай публіцыстыцы ўпершыню адбыўся зрух у бок асэнсавання ўласнай самабытнасці, усведамлення нацыянальнай літаратурнай мовы як найважнейшага кампанента культуры, незаменнага фактару духоўнай эвалюцыі народа. Тады ж, яшчэ ў эпоху Адраджэння і барока, была абгрунтавана выключная роля духоўнага лідара нацыі ва ўсіх грамадскіх стасунках.

**Мікола ЧЭМЕР.**
*gilevitch@ng-press.by*
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**